Источник: **«Звязда» - 2012-10-30**

## Вайніловічы

**Вайніловічы — старажытны беларускі шляхецкі род з чатырохсотгадовай гісторыяй**

**Прозвішча Вайніловічы добра вядома жыхарам Беларусі: носьбіты гэтага прозвішча пакінулі значны след у гісторыі нашай краіны, развіцці яе эканомікі і культуры.**

Вайніловічы — старажытны беларускі шляхецкі род герба "Сыракомля". Гісторыя гэтага роду налічвае больш за чатырыста гадоў. Прадстаўнікі роду займалі розныя пасады ў мясцовай адміністрацыі Вялікага Княства Літоўскага: падчашы мсціслаўскі *(Траян Вайніловіч)*, падчашы слонімскі *(Леў Казімір Вайніловіч)*, стольнік мазырскі *(Людвік Вайніловіч)*, каралеўскі сакратар, харужы ваўкавыскі, сеймавы пасол *(Тамаш Вайніловіч)*, стольнік навагрудскі *(Габрыэль Вайніловіч)*, стольнік мазырскі *(Крыштоф Вайніловіч)*, падваявода навагрудскі *(Ян Вайніловіч)*, маршалак шляхты Слуцкага павета *(Антоній Вайніловіч)*, маршалак шляхты Навагрудскага павета*(Юзаф Вайніловіч)* і іншыя. Род меў кроўныя сувязі з іншымі славутымі родамі беларускай зямлі — Манюшкамі, Ваньковічамі, Адынцамі. Вылучаецца некалькі ліній роду: *савіцка-пузаўская лінія*(Мазырскі павет, XVII ст.), макранская (Пінскі павет, XIX ст.), *нянькаўская* (Навагрудскі павет, XIX ст.). Найбольш вядомыя прадстаўнікі роду: *Антон Вайніловіч* (1801 — 1845), дваранскі рэвалюцыянер; *Восіп Вайніловіч* (1860 — 1890), рэвалюцыянер-народнік, адзін са стваральнікаў Варшаўскага нарадавольніцкага гуртка беларускіх студэнтаў. З імем прадстаўніка роду —*Эдварда Адама Вайніловіча* (1847 — 1928) — непасрэдна звязаны адзін з адметных архітэктурных помнікаў Мінска, своеасаблівая візітная картка горада —Чырвоны касцёл імя святых Сымона і Алены.

Эдвард Вайніловіч быў не толькі адным з найбагацейшых памешчыкаў, але і адным з самых адукаваных людзей Мінскай губерні ў другой палове XIX стагоддзя. У памяці нашчадкаў ён застаўся як мецэнат, грамадскі і палітычны дзеяч, шчыры хрысціянін. Сваё багацце Вайніловіч нажыў уласнай працай. Скончыў знакамітую Слуцкую гімназію, затым Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Працаваў інжынерам на Пуцілаўскім заводзе, праходзіў стажыроўку на заводах Германіі і Бельгіі. Там навучыўся збіраць лакаматывы, вадзіць паравозы. Завяршыў адукацыю ў Сарбоне і Сілезіі. Эдвард Вайніловіч абіраўся ганаровым міравым суддзёй Слуцкага павета, старшынёй Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, быў членам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі. Сам Пётр Сталыпін за здольнасці і рэфарматарскія адносіны да працы называў Вайніловіча "мінскім Бісмаркам", прапаноўваў яму заняць у сваім урадзе пасаду віцэ-прэм'ера або міністра сельскай гаспадаркі. Але Эдвард Вайніловіч прыняў рашэнне працаваць на карысць эканомікі і дабрабыту свайго краю: адкрыў камерцыйнае вучылішча, удасканальваў сельскагаспадарчую працу на аснове навейшых дасягненняў, фінансаваў першае легальнае беларускае выдавецтва "Загляне сонца і ў наша ваконца". Быў шчырым хрысціянінам: ахвяраваў грошы на будаўніцтва касцёлаў, цэркваў, сінагогаў і мячэцяў, пабудову інтэрнатаў для дзяцей-сірот у Клецку і Капылі. Эдвард Адам Вайніловіч заўсёды быў прыхільнікам незалежнай Беларусі, выступаў адным з ініцыятараў вядомага Слуцкага паўстання 1920 года. У 1920 годзе насуперак сваёй волі шляхціц пакінуў Беларусь і эміграваў у Польшчу. Там у горадзе Быдгашчы і закончыўся яго зямны шлях. Ён заўсёды марыў вярнуцца на радзіму, і гэта адбылося: вернікі-католікі зрабілі ўсё магчымае, каб перанесці прах

Эдварда Вайніловіча ў Мінск. 11 чэрвеня 2006 года ён быў перазахаваны каля сцен велічнага Чырвонага касцёла.

На жаль, жыццё не было літасцівым да гэтага чалавека. Вялікае гора напаткала яго сям'ю: у 1897 годзе ад "іспанкі" памёр яго дванаццацігадовы сын Сымон, а ў 1903 годзе, не дажыўшы аднаго дня да свайго дзевятнаццацігоддзя, памерла дачка Алена. І толькі вера ў Бога дапамагла Вайніловічу выжыць. Пасля трагічных падзей Вайніловіч прымае рашэнне ахвяраваць вялікія сродкі на ўзвядзенне ў Мінску Чырвонага касцёла імя святых Сымона і Алены. На працягу сваёй больш чым стагадовай гісторыі, нягледзячы на рэвалюцыю, дзве сусветныя вайны і смутныя часы ваяўнічага атэізму, касцёл не быў разбураны і сёння застаецца адным з найпрыгажэйшых архітэктурных помнікаў сталіцы і сімвалам веры.




### Паходжанне прозвішча

### Сучасныя Вайніловічы

Вайніловічы мелі вялікія зямельныя ўладанні ў Мазырскім, Пінскім, Навагрудскім і Слуцкім паветах. На жаль, ад былых радавых маёнткаў амаль нічога не засталося. Але прозвішча*Вайніловіч* сустракаецца ў дзесяці раёнах Беларусі: Аршанскім і Сенненскім раёнах Віцебскай вобласці, Бярэзінскім, Мінскім, Нясвіжскім і Уздзенскім раёнах

Мінскай вобласці, Асіповіцкім, Горацкім і Клімавіцкім раёнах Магілёўскай вобласці, а таксама ў горадзе Мінску. Неаднаразова вышэйзгаданае прозвішча адзначаецца на тэрыторыі Літвы і Польшчы. Атрымаць адказ на пытанне, ці маюць якое-небудзь дачыненне носьбіты гэтых прозвішчаў да знакамітага роду, могуць дапамагчы толькі архіўныя пошукі. Спарадычна ў сучаснай беларускай іменаслоўнай сістэме адзначаюцца прозвішчы *Вайніла* (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці, Валожынскі раён Мінскай вобласці), *Вайнілка* (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці, Мядзельскі раён Мінскай вобласці). На беларускіх землях захаваліся старажытныя паселішчы з назвамі *Вайнілавічы* (вёска ў Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці, Нясвіжскім раёне Мінскай вобласці), *Вайнілаўцы*(вёска ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці), *Вайнілаўшчына* (вёска і хутар у Іўеўскім раёне Гродзенскай вобласці, Валожынскім і Стаўбцоўскім раёнах Мінскай вобласці), *Вайніліха*(хутар у Іўеўскім раёне Гродзенскай вобласці), *Вайнілы* (Чавускі раён Магілёўскай вобласці),*Вайнілава* (вёска ў Чэрвенскім раёне Мінскай вобласці).

**Ігар Капылоў.**